# БІБЛІЯТЭКА БДПУ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

# BSPU LIBRARY: HISTORY AND MODERNITY

***Кажамякін Генадзь Вячаслававіч*** *– вядучы бібліятэкар, Бібліятэка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук (Рэспубліка Беларусь)*

***Kazhamyakin Guenadz*** *– BSPU library, lead librarian, Candidate of Philological Sciences (Belarus)*

***Анатацыя****. У гэтым артыкуле разглядаецца гісторыя бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Гаворка таксама ідзе і пра яе няпросты шлях да ўзнаўлення фонду пасля Другой сусветнай вайны, а таксама сучасны стан, адваведны запатрабаванням новага часу.*

***Abstract****. This article explores the history of the library of the Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University. It also discusses its difficult path to restoring its collection after World War II, as well as its current state, which meets the requirements of modern times.*

***Ключавыя словы****: Бібліятэка БДПУ; гісторыя, сучаснасць, развіццё; кніжныя фонды; супрацоўнікі бібліятэкі; вайна; узнаўленне; электронныя рэсурсы*

***Keywords****: BDPU Library; history, present, development; book collections; library staff; war; reconstruction; electronic resources*

21 лістапада 2024 года спаўняецца 110 год з дня пачатку існавання бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. Яна вядзе свой адлік ад Мінскага настаўніцкага інстытута (1914), у якім існавала свая чытальня.

Некаторы час наша ўстанова належала БДУ як педагагічны факультэт. Калі ўпачатку 1930-х гадоў стварылі зноў самастойны педагагічны інстытут, узнавілі і бібліятэку. Яе ўзначаліла Надзея Іванаўна Міхалап (1893–1965). Яна кіравала ад 1930-х гадоў да пасляваеннага часу. Цяперашні ўніверсітэт на той час называўся Мінскім педагагічным інстытутам, пазней яму надалі імя А. М. Горкага.

Таксама трэба адзначыць, што Надзея Іванаўна была жонкай вядомага мастака – Мікалая Пракопавіча Міхалапа (1886–1979), які да пачатку вайны займаў пасаду дырэктара цяперашняга Нацыянальнага мастацкага музея.

Даваенны фонд нашай бібліятэкі налічваў дзясяткі тысяч асобнікаў кніг і часопісаў. Напрыклад, у 1934/1935 навучальным годзе бібліятэка мела 105 923 адзінак захоўвання [1, с. 341].

У часы Другой сусветнай вайны амаль увесь фонд бібліятэкі загінуў. Частка кніг у гэты летні перыяд заставалася на руках у чытачоў. Цяпер можна знайсці лічаныя асобнікі, на якіх засталіся нашы тагачасныя штампы.

Напрыклад, на тытульным аркушы выдання *Каптерев П. Новая русская педагогия. СПб, 1914* ёсць авальныя фіялетавыя штампы з надпісам: “Библиотека Минского Педагогического Института”.

Пасля заканчэння вайны, калі бібліятэка зноў пачала сваю працу, адбывалася ўзнаўленне нашых фондаў. Па-першае, паводле негалоснага правіла чытач пры запісе ў бібліятэку мусіў падарыць нам адну кнігу; па-другое, літаратура перадавалася з асабістых кнігазбораў грамадзянаў; па-трэцяе, рабілася гуманітарная дапамога ад іншых кніжніц, у тым ліку – з Масквы, Ленінграда, Пскоўскай вобласці… Нашы супрацоўнікі дзеля таго ездзілі і ў паездкі па рэгіёнах.

У жніўні 1946 г. бібліятэку ўзначаліў Рыгор Іванавіч Валынец (1919–1996). У часы яго кіравання (47 гадоў) была набыта вялікая колькасць кніг, часопісаў. Паралельна з ім працяглы час працаваў на пасадзе начальніка аддзела кнігазахоўвання Яўген Уладзіміравіч Кашэўскі (1931–2007). Разам з Р. Валынцом ён вёў шырокую дзейнасць па набыцці новай літаратуры, рэгуляванні колькасці фонду, вызначэнні дакладных тэматычных патрэбаў для студэнтаў. Абодва яны мелі высокую ўзнагароду – значок “За выдатную працу” ад міністэрства культуры БССР. Памятаю, як Я. Кашэўскі з гонарам паказваў пасведчанне да значка, падпісанае міністрам культуры Кацярынай Фурцавай.

Трэба адзначыць, што наш фонд дасягнуў даваеннага ўзроўню толькі ў 1959 годзе.

8 верасня 1993 года Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага быў пераўтвораны ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт (БДПУ); у 1995 г. ён атрымаў імя народнага паэта Беларусі Максіма Танка, які памёр у тым жа годзе. Так рабілася ўвекавечанне яго памяці.

У 1994 г. дырэктарам бібліятэкі стала Надзея Паўлаўна Сяткоўская (н. 1957), якая прадоўжыла дзейнасць па развіцці бібліятэкі. Яна мае ўзнагароду – Медаль Францыска Скарыны (2003).

10 верасня 1997 г. быў выдадзены загад № 48 рэктара БДПУ Л. Н. Ціханава “Аб змяненні структуры бібліятэкі і стварэнні аддзела рэдкай кнігі”, дзе адзначана, што ён створаны “з мэтай выкарыстання рэдкай кнігі ў навукова-даследчай працы і навучальным працэсе”. 12 лістапада 2014 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё Залы рэдкай кнігі. У зале размяшчаюцца музейныя тэматычныя экспазіцыі, праводзяцца экскурсіі. Фонд рэдкай кнігі складае каля 8 000 адзінак захоўвання. Робіцца іх электроннае апісанне. Найстарэйшая па часе надрукавання – кніга 1752 г. Гэта 3-ці том шматтомнага выдання з доўгай назвай “Древняя история об египтянах, о карфагенянах, об ассирианах, о вавилонянах, о мидянах, персах, о македонянах и о греках” Шарля Ралена. Усяго мы маем шэсць асобнікаў, выдадзеных у XVIII стагоддзі. Па храналогіі фонд рэдкай кнігі складае экзэмпляры, надрукаваныя да сярэдзіны XX стагоддзя. Акрамя таго, у фондзе

рэдкай кнігі, паводле некаторых вызначальных момантаў, захоўваюцца і пазнейшыя выданні, калі яны маюць каштоўнасці ў афармленні. Сярод іх – кнігі-малюткі, вялікафарматныя кнігі, факсімільныя ўзнаўленні ранейшых рарытэтаў, аўтографы аўтараў ці вядомых асобаў.

Па колькасці асобнікаў бібліятэка БДПУ да канца XX стагоддзя займала чацвёртае месца сярод кніжніц ВНУ.

Бібліятэка займалася і займаецца і культурна-асветніцкай дзейнасцю. За ўвесь час рабіліся выставы кніг для круглых сталоў, семінараў, канферэнцый. Таксама трэба адзначыць выступы перад аўдыторыямі студэнтаў з паказам кніг або зладжваннем прэзентацый. Тэматыка была разнастайная – ад прапаганды выданняў да лекцый, прысвечаных, напрыклад, вядомаму навукоўцу, славяназнаўцу Яўхіму Карскаму, або нацыянальным дыяспарам, якія жывуць у Беларусі і іншыя тэмы.

Бібліятэка бярэ ўдзел у розных грамадскіх справах, напрыклад, у штогадовай спартакіядзе сярод работнікаў БДПУ, у Мінскім паўмарафоне і г. д.

У бібліятэцы развіваюцца электронна-інфармацыйныя рэсурсы. З 2019 года ажыццяўляецца вядзенне і адміністраванне профілю БДПУ ў сістэме SCIENCE INDEX на базе звестак Расійскага індэкса навуковага цытавання (РІНЦ), размешчанага на платформе eLIBRARY.RY, праводзіцца сістэматычная рэгістрацыя і рэдагаванне аўтарскіх профіляў выкладчыкаў БДПУ, размяшчаюцца часопісы і зборнікі матэрыялаў канферэнцый універсітэта, выдадзеных у Вучэбна выдавецкім цэнтры БДПУ.

У 2022 года пачаты працэс укаранення аўтаматызаванай інфармацыйна-бібліятэчнай сістэмы "МегаПро" (установка, адаптацыя і канвертацыя звестак). З 1 лістапада 2022 года электронны каталог запрацаваў пад кіраваннем АІБС "МегаПро". Электронны каталог уключае шэсць баз звестак: Кнігі, Артыкулы, Дысертацыі, Справаздачы аб НДР, Рэдкія кнігі, Медыятэка.

Для карыстальнікаў існуе пяць абанементаў (вучэбнай літаратуры, абанемент навуковай і мастацкай літаратуры і тры абанементы на філіялах), чытальная зала (з адкрытым доступам да фонду), зала для самастойнай працы студэнтаў, чытальная зала для навуковых работнікаў і зала рэдкай кнігі.  Агульная колькасць пасадачных месцаў у чытальных залах – 125.

Такім чынам, бібліятэка БДПУ сягнула на новую ступень свайго развіцця: яна ўкараняе новыя тэхналогіі, забяспечвае на высокім узроўні інфармацыйнае суправаджэнне навуковай, адукацыйнай і сацыякультурнай дзейнасці ўніверсітэта, фармуе новую бібліятэчную прастору, якая адпавядае сучасным патрабаванням і чаканням карыстальнікаў.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларускі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Максіма Танка: гісторыя і сучаснасць (1922 – 2002 гг. ). – Мінск, 2002. – 350 с.